(ознакомительный фрагмент)

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

УДК 946.6 (1—22) 1921/1927

Бяспалая Марыя Аркадзьеўна

# Беларуская вёска ў 1921—1927 гг.

07.00.02 — айчынная гісторыя

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
доктара гістарычных навук

Мінск 1999

Работа выканана ў Беларускім універсітэце культуры

Навуковы кансультант — доктар гістарычных навук, прафесар А.П.Грыцкевіч

Афіцыйныя апаненты — доктар гістарычных навук, прафесар У.М.Міхнюк

доктар гістарычных навук, прафесар У.І.Навіцкі

доктар гістарычных навук, прафесар Э.Р.Іофэ

Апаніруючая арганізацыя — Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт

Абарона адбудзецца 14/X.99 г. на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.21.03 пры Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка па адрасе: 220050, г.Мінск, вул.Савецкая, 18 ауд. 482. ў 14 гадзін

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

Актуальнасць тэмы дысертацыі абумоўлена разнастайнасцю сацыяльна-эканамічных і культурных працэсаў, якія праявіліся ў сучасным грамадстве, альтэрнатыўнасцю падыходаў у вызначэнні перспектыў яго развіцця, што патрабуе глыбокага асэнсавання аб'ектыўнай гістарычнай карціны, пазітыўных і негатыўных фактараў, якія дзейнічалі ў розныя гістарычныя перыяды. Менавіта ў 1920-я гады закладваўся фундамент новага сацыяльнага ладу. На працягу будучых дзесяцігоддзяў з рознай ступенню выразнасці ў ім праяўляліся асноўныя прынцыпы ўзаемаадносін дзяржаўных структур з насельніцтвам, якія пачалі фарміравацца ў 1920-я гады.

Апошнія дасягненні гістарычнай навукі, сучасная метадалогія навуковых даследаванняў стварылі магчымасць крытычнага аналізу навуковых пазіцый, якія выпрацаваны ў савецкі перыяд, што дазваляе разглядаць абраную тэму як актуальную. Гэта патрабуе новага метадалагічнага падыходу да вывучэння ўнутрывясковай сітуацыі, якая склалася пад уплывам дзяржаўнай палітыкі, аналізу яе развіцця з пункту гледжання селяніна, а не з пазіцыі партыйных і савецкіх органаў. Без разгляду пазіцыі вяскоўцаў, аналізу іх рэакцыі на афіцыйную палітыку не можа быць сфарміравана праўдзівая карціна ўнутранага стану дакалгаснай вёскі. Немагчыма дасягнуць навукова абгрунтаваных вынікаў без разгляду сацыяльна-эканамічнай і культурнай дзяржаўнай палітыкі, яе ўздзеяння на сялянства. Актуальнасць тэмы абумоўліваецца і тым, што без аб'ектыўнага падыходу да аналізу ўнутрывясковай сітуацыі ў 1921—1927 гг., аналізу спецыфікі дзяржаўнай палітыкі ў беларускай вёсцы немагчыма рабіць навукова апраўданыя высновы аб пераходзе да палітыкі калектывізацыі і, на нашу думку, нават аб сацыяльна-эканамічным і псіхалагічным стане сённяшняй вёскі.

Актуальнасць тэмы вызначаецца і ўзрастаннем ролі культуры ў сучасным грамадстве, наданнем прыярытэту духоўнаму свету чалавека і прызнаннем неабходнасці яго гарманічнага развіцця. Аднак без аналізу культурнай сітуацыі ў канкрэтных сацыяльных умовах немагчыма выявіць агульныя заканамернасці, асаблівасці і перспектывы культурнага развіцця. Перыяд 1921—1927 гг. найбольш цікавы, таму што дае рэдкую магчымасць прааналізаваць укараненне ў вясковым асяроддзі новай культуры, новай эканамічнай і сацыяльнай палітыкі, уздзеянне гэтых фактараў на сацыякультурны стан беларускай вёскі.

Неабходна прызнаць, што з пункту гледжання савецкай гістарычнай навукі пытанне сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця азначанага перыяду распрацавана дастаткова, асабліва роля партыі ў гэтым працэсе, уведзены ў навуковы зварот багаты фактагалічны матэрыял. Аднак калі

мы далучаемся да сучасных навуковых школ, апіраемся на розныя тэарэтычныя плыні, прызнаём за культурай ролю галоўнага фактару ў развіцці чалавецтва, то, безумоўна, трэба многае пераасэнсаваць у развіцці вёскі азначанага перыяду, перш за ўсё немагчыма пакінуць па-за рамкамі навуковага аналізу яе сацыяльна-псіхалагічны настрой. У сувязі з тым, што ў цэнтры нашага даследавання знаходзіцца беларускае сялянства, ёсць усе падставы для карыстання прынцыпамі антрапалагічна арыентаванай гісторыі. Гэта дае магчымасць паказаць адносіны сялянства да шматлікіх і разнастайных партыйных і дзяржаўных дырэктыў, новай сацыяльна-эканамічнай і культурнай палітыкі. Акрамя таго, разгляд абранай тэмы з пазіцыі сялянства мае і маральнае значэнне, і грамадскі аспект, таму што аддаецца даніна павагі чалавеку, сапраўднаму творцу гісторыі.

Новы падыход да праблем развіцця беларускай вёскі ў 1920-я гады дазваляе акрэсліць спецыфіку гэтага перыяду, паказаць неадпаведнасць новай эканамічнай палітыкі, зямельнай рэформы надзеям сялянства, савецкай культуры традыцыйнай сялянскай.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**.

Работа выканана па ініцыятыве аўтара.

Галоўнай **мэтай** даследавання з'яўляецца комплексны аналіз працэсаў, якія развіваліся ў вёсцы пад уздзеяннем дзяржаўнай аграрнай і культурнай палітыкі, і іх уплыву на фарміраванне ўнутрывясковай сітуацыі.

У адпаведнасці з вызначанай мэтай аўтарам рашаюцца наступныя **задачы**:

— характарызуюцца прыярытэтныя накірункі сацыяльна-эканамічнай і культурнай дзяржаўнай палітыкі на вёсцы;

— разглядаюцца асаблівасці праяўлення новай эканамічнай палітыкі ў беларускай вёсцы і пазіцыя сялянства;

— раскрываецца неадпаведнасць асноўных накірункаў дзяржаўнай зямельнай палітыкі спадзяванням сялянства;

— звяртаецца ўвага на неадэкватнасць многіх дзяржаўных тэарэтычных распрацовак рэальнай сітуацыі;

— выяўляюцца сувязі паміж сацыяльна-эканамічнай і культурнай палітыкай дзяржавы;

— разглядаюцца структура, кадравае забеспячэнне, асноўныя накірункі і метады палітасветработы і яе ўспрыманне сялянствам;

— вызначаюцца суадносіны афіцыйнай культурнай палітыкі з духоўнай традыцыяй вёскі;

— аналізуецца ўзровень інфармацыйнага забеспячэння дзейнасці палітыка-асветных устаноў.

**Аб'ектам** нашага даследавання з'яўляецца вёска Цэнтральнай і Усходняй Беларусі ў вызначаных храналагічных рамках.

**Прадмет** даследавання складаюць галоўныя накірункі дзяржаўнай аграрнай і культурнай палітыкі, яе ўкараненне ў вясковае асяроддзе і яе ўспрыманне сялянствам.

**Храналагічныя рамкі** даследавання патрабуюць навуковага абгрунтавання. Дысертант вызначыў перыяд 1921—1927 гг. і, такім чынам, адмовіўся ад прынятай у савецкай гістарыяграфіі перыядызацыі гісторыі 20—30-х гадоў на аднаўленчы перыяд (1921—1925 гг.), пачатак індустрыялізацыі, першую пяцігодку і г.д. Аўтар падзяляе пазіцыю сучасных навукоўцаў аб выдзяленні ў асобны перыяд менавіта 1921—1927 гг. і пагаджаецца з ідэяй, зафіксаванай у рэзюме аднаго з “круглых сталоў”: “Калі мы, гісторыкі, цяпер гаворым пра 20—30-я гады, дык перад намі паўстае пытанне аб новай іх перыядызацыі...”. Гістарычныя крыніцы, на аснове якіх развіваўся працэс даследавання, дазваляюць зрабіць вывад аб храналагічнай непарыўнасці з’яў, што адбываліся ў беларускай вёсцы ў 1921—1927 гг.

Разам з тым аналіз дакументальных крыніц дазваляе вызначыць у рамках 1921—1927 гг. якасна неаднародныя перыяды, асабліва гэта тычыцца сацыяльнай палітыкі. У савецкай гістарычнай навуцы сустракаліся спробы звярнуць увагу на своеасаблівасць першых гадоў нэпа (1921—1923 гг.), выдзяляліся ў асобны перыяд 1924—1925 гг., аб чым сведчаць абарона шэрага дысертацый і публікацыя манаграфій. Аднак падкрэслім, што агульныя тэндэнцыі ў дзяржаўнай палітыцы працягвалі дзейнічаць на працягу ўсяго перыяду 1921—1927 гг.

Пачатак перыяду звязаны з завяршэннем грамадзянскай вайны і рашэннем X з’езда РКП(б) аб пераходзе да нэпа, заканчэнне — з абвяшчэннем XV з’ездам ВКП(б) курса на калектывізацыю. Гэтыя рашэнні выклікалі кардынальныя змены асноўных накірункаў дзяржаўнай палітыкі і метадаў яе ажыццяўлення як у 1921 г., так і пасля 1927 г. Падкрэслім, што ў рэзалюцыі X з’езда РКП(б) па нацыянальным пытанні прадугледжвалася развіццё культуры раней прыгнечаных нацый. V з’езд КП(б)Б (кастрычнік 1921 г.) таксама падкрэсліваў неабходнасць у асветніцкай рабоце ўважліва ўлічваць нацыянальныя асаблівасці насельніцтва. Аднак XI з’езд КП(б)Б (лістапад 1927 г.) вызначыў нацыянальна-дэмакратычны рух як контррэвалюцыйную з’яву і заклікаў да барацьбы з ёю. Тым самым пасля 1927 г. пачаліся выразныя змены і ў дзяржаўнай культурнай палітыцы.

Неабходна заўважыць, што ў гэты час развіваўся працэс узбуйнення тэрыторыі Беларусі, які таксама аказаў значны ўплыў на ўнутрыпалітычную сітуацыю ў рэспубліцы.

Пры рабоце над дысертацыяй аўтар абапіраўся на наступную **гіпотэзу**: дзяржаўная аграрная і культурная палітыка парушала традыцыйны вясковы ўклад, не адпавядала спадзяванням большасці сялянства і не змагла стаць галоўнай умовай аднаўлення сельскай гаспадаркі, далучэння са-

вецкай беларускай вёскі да тагачасных эканамічных і культурных сусветных працэсаў.

**<u>Метадалогія і метады навуковага даследавання.</u>** Сучасны ўзровень гістарычнай навукі дазваляе даследчыку выбіраць найбольш адпаведныя яго пазіцыі метадалагічныя падыходы пры вывучэнні вызначанай праблемы. У папярэднія дзесяцігоддзі шырока выкарыстоўваліся канцэпцыя фармацыйнага грамадства, прынцып партыйнасці, але яны згубілі сваю актуальнасць. Сярод адмоўных рыс адзначанай метадалогіі трэба вылучыць такую, як "ігнараванне светаўспрымання людзей, сістэмы іх духоўных каштоўнасцей і псіхалогіі".

Метадалагічны падыход, пакладзены ў аснову дысертацыйнага даследавання, вызначаны ў залежнасці ад яго мэты. У цэнтры нашай увагі — працэсы, якія адбываліся ў вёсцы пад уздзеяннем аграрнай і культурнай палітыкі дзяржавы. У адпаведнасці з названай праблемай дысертант абірае галоўным аб'ектам вывучэння беларускую вёску 1920-х гадоў і яе жыхароў. Менавіта гэтая акалічнасць служыць падставай для ўжывання аўтарам антрапалагічнага і аксіялагічнага падыходаў ў тлумачэнні даследуемых праяў дзяржаўнай палітыкі і яе ўспрымання сялянствам. На думку аўтара, такія метадалагічныя падыходы найбольш адпавядаюць прынцыпам гістарызму і аб'ектыўнасці і апраўданы не толькі з пункту гледжання дасягненняў сённяшняй навукі, але і маралі. Яны дазваляюць сярод мноства вялікіх і малых спраў разгледзець праблемы, якія найбольш хвалявалі вясковага жыхара.

Усебаковы аналіз вывучаемага аб'екта ажыццяўляўся з дапамогаю такіх спецыяльна-гістарычных метадаў, як, у першую чаргу, гісторыка-сістэмны. У меншай ступені выкарыстаны гісторыка-генетычны і гісторыка-параўнальны метады.

**<u>Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.</u>** Спроба аналізу сацыяльна-эканамічнай і культурнай сітуацыі ў беларускай вёсцы 1920-х гадоў з пункту гледжання яе жыхароў зроблена ўпершыню. Аўтар зыходзіў з высновы, што ў цэнтры ўсіх гістарычных з'яў знаходзіцца чалавек з уласцівымі яму прывычкамі, поглядамі, пачуццямі, сістэмай духоўных каштоўнасцей. Мы імкнуліся прааналізаваць вядомыя раней і зусім невядомыя з'явы і факты ў рэчышчы новых дасягненняў гістарычнай навукі. Пры неабходнасці навукова аспрэчваем асобныя трывалыя стэрэатыпы, напрыклад аб значэнні нэпа для развіцця сельскай гаспадаркі, аб выніках рашэння зямельнага пытання, аб ролі новай культуры і іншыя, што таксама вызначае навуковую навізну работы.

Дадзеная праца грунтуецца на традыцыйных для гістарычнай навукі крыніцах. У навуковы зварот уводзяцца шматлікія, раней не запатрабаваныя даследчыкамі архіўныя матэрыялы. Гэта дазволіла прааналізаваць комплекс праблем, якія непасрэдна звязаны з рэакцыяй сялянства на дзяржаўную эканамічную і культурную палітыку, і ў выніку атрымаць новыя

высновы. Выкарыстанне не даследаваных да гэтага часу крыніц дапамагло стварыць агульную карціну вясковага жыцця, па-новаму ацаніць эфектыўнасць дзяржаўнай палітыкі. Вывучэнне сацыяльна-псіхалагічнай сітуацыі ў вёсцы, а таксама новыя падыходы да аналізу праблем культуры абумовілі цікавасць аўтара да распрацовак сацыяльна-псіхалагічнай і культуралагічнай тэматыкі.

Практычнае значэнне атрыманых вынікаў можа быць у прадаўжэнні навуковых распрацовак на падставе вывадаў дысертацыі, якія будуць паглыбляць асобныя аспекты даследуемай праблемы. Навуковая рэнтабельнасць нашай работы можа выражацца ў выкарыстанні атрыманых аўтарам вынікаў пры падрыхтоўцы манаграфій, вучэбных дапаможнікаў і навукова-метадычных выданняў, а таксама пры чытанні лекцый і правядзенні семінарскіх заняткаў па курсах “Гісторыя Беларусі”, “Эканамічная гісторыя Беларусі”, “Гісторыя культуры Беларусі”.

Аўтар спадзяецца, што дысертацыя будзе мець сацыяльнае значэнне і выканае поўную выхаваўчую функцыю. Яе тэарэтычныя палажэнні, зробленыя на аснове вывучэння новых фактаў, дазваляюць з пазіцыі агульначалавечых каштоўнасцей фарміраваць гуманістычныя арыентацыі і грамадзянскія якасці членаў сучаснага грамадства. Акрамя таго, знойдзеныя падчас працы ў архівах каштоўныя матэрыялы могуць папоўніць фонды і экспазіцыі гісторыка-краязнаўчых і літаратурна-мастацкіх музеяў.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

• Новая эканамічная палітыка ў беларускай вёсцы ў асноўным праявілася ў выглядзе падатковай палітыкі, якая не адпавядала эканамічным магчымасцям вёскі і не садзейнічала станоўчым перспектывам яе эканамічнага развіцця.

• Дзяржаўная зямельная палітыка ў 1921–1927 гг. не адпавядала спадзяванням сялянства, зямельная рэформа не была даведзена да канца, характарызавалася класавай накіраванасцю і аказалася непрыдатнай для эфектыўнага развіцця сельскай гаспадаркі.

• Сацыяльная палітыка дзяржавы ў першы год нэпа садзейнічала ўзнікненню супярэчнасцей паміж большасцю сялянства і ўладай. Пераход дзяржавы ў наступныя гады да саюзу з серадняком і апоры на бедняка прывёў да абвастрэння сацыяльнай сітуацыі ў вёсцы, расколу яе на супрацьлеглыя групоўкі і фарміравання асобнага сацыяльнага асяроддзя, арыентаванага на падтрымку дзяржаўнай палітыкі.

• Немагчымасць хуткага дасягнення сельскай гаспадаркай высокага ўзроўню вымушала дзяржаву прымаць новыя рашэнні, якія часцей за ўсё з'яўляліся вынікам тэарэтычных пошукаў і не заўсёды адпавядалі

рэальнаму жыццю, а таму не маглі садзейнічаць хуткім зрухам у развіцці сельскай гаспадаркі.

• Народная культура і культурнае асветніцтва, якое актыўна развівалася ў першыя гады нэпа, замяняліся палітычным асветніцтвам, галоўнымі мэтамі якога сталі прапаганда лініі партыі і сацыялістычных міфаў, выхаванне насельніцтва на аснове новай, савецкай маралі і партыйнай ідэалогіі.

• Палітыка-асветніцкая работа аказалася малаэфектыўнай па прычыне недастатковага матэрыяльнага, кадравага, інфармацыйнага забеспячэння, а таксама адсутнасці пераемнасці ў змесце, формах, метадах з народнай духоўнай культурай.

• Наяўнасць на вёсцы негатыўных адносін да дзяржаўнай аграрнай і культурнай палітыкі, якая парывала з традыцыйным укладам вясковага жыцця і ўкаранялася без уліку асаблівасцей сацыяльна-псіхалагічнага настрою сялянства.

• Галоўная роля ў адраджэнні сельскай гаспадаркі належала сялянству, якое працягвала займацца сваёй спрадвечнай справай, нягледзячы на нездавальняючы характар падатковай, зямельнай, сацыяльнай, культурнай палітыкі дзяржавы.

## Апрабацыя вынікаў дысертацыі

Вынікі навуковых даследаванняў аўтара, якія ўключаны ў дысертацыю, апрабаваны на рэспубліканскіх навуковых і навукова-метадычных канферэнцыях: "Нацыянальная культура як аснова зместу навучання і выхавання студэнтаў" (Мінск, 1993 г.), "Актуальныя праблемы і навуковыя пошукі ў галіне культуры і мастацтва" (Мінск, 1994 г.), "Культуралагічная падрыхтоўка ў сістэме ВНУ" (Мінск, 1997 г.), "Стандарты культуралагічнай і мастацкай адукацыі" (Мінск, 1999 г.), на міжнародных навуковых і навукова-практычных канферэнцыях: "Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць" (Мінск, 1997 г.), "Жаночае аблічча Беларусі" (Мінск, 1997 г.), "Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання" (Мінск, 1998 г.), на III (1997 г.) і IV (1998 г.) міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях, прысвечаных Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск).

## Публікацыя вынікаў

Аўтарам выдадзена манаграфія "Беларуская вёска ў першыя гады нэпа (1921—1923 гг.)" [Мінск: Бел. ун-т культуры, 1999.— 253 с.], а таксама апублікаваны артыкулы і тэзісы ў навуковых часопісах і зборніках. Па

выніках навуковых канферэнцый надрукаваны даклады і тэзісы дакладаў. Агульны аб'ём публікацый каля 400 старонак.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, асноўнай часткі, якая ўключае чатыры главы, заключэнне, спіс крыніц і літаратуры, дадатак. Поўны аб'ём дысертацыі — 199 с.

Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры ўключае 570 найменняў і займае 35 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**Уводзіны** ўключаюць агульную характарыстыку працэсаў, якія адбываліся ў межах вывучаемага аб'екта пад уздзеяннем дзяржаўнай аграрнай і культурнай палітыкі ў вызначаны гістарычны перыяд. Паказваецца неабходнасць іх аналізу як з навуковай, так і з грамадзянскай пазіцыі.

**Агульная характарыстыка работы** складаецца з абгрунтавання актуальнасці тэмы, мэты і задач, аб'екта і прадмета, метадалогіі і метадаў даследавання. Тут вызначаюцца навуковая навізна і практычная значнасць атрыманых вынікаў. Фармулююцца гіпотэза і асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону. Паказаны апрабацыя вынікаў дысертацыі, колькасць апублікаваных работ, структура і аб'ём дысертацыі.

**Асноўная частка** складаецца з чатырох глаў, якія дзеляцца на параграфы, а два параграфы трэцяй главы — на падпараграфы.

**Першая глава** прысвечана аналізу гістарычных крыніц і разгляду агульнай канцэпцыі.

Першы параграф утрымлівае агляд гістарычных крыніц і навуковай літаратуры па тэме дысертацыі. Аўтар адзначае, што наяўнасць падрабязнага гістарыяграфічнага аналізу ў манаграфіі У.М.Міхнюка па блізкай да разглядаемай праблеме, а таксама артыкулаў А.М.Сарокіна па гістарыяграфіі аграрнай палітыкі не памяншаюць патрэбы ў ім. Наадварот, новыя метадалагічныя падыходы, вызваленне гістарычнай навукі ад палітычных і ідэалагічных патрабаванняў абумоўліваюць неабходнасць аналізу існуючай навуковай літаратуры па вывучаемай тэме, пошуку новых гістарычных крыніц.

Аўтар лічыць магчымым выдзеліць у асобную групу даследаванні 1920—1930-х гадоў, прысвечаныя стану сельскай гаспадаркі і вёскі ў цэлым. Каштоўнасць гэтых матэрыялаў — у адсутнасці прыметнай ідэалагізацыі, у "свежасці" фактаў, не адшліфаваных часам, якія выразна ілюструюць асаблівасці развіцця вёскі. Мы маем на ўвазе артыкулы А.Алуфа, А.Бонч-

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

1. Бяспалая М.А. Беларуская вёска ў першыя гады нэпа (1921—1923 гг.).— Мінск: Бел. ун-т культуры, 1999.— 253 с.

2. Бяспалая М.А. Аб культурна-асветніцкім жыцці беларускай вёскі ў 20-я гг. // Пытанні культуры і мастацтва Беларусі.— Мінск: Вышэйш. шк., 1994.— Вып. 13.— С.116—121.

3. Бяспалая М.А. Эканамічнае развіццё беларускай вёскі (20-я гг. XX ст.) // Бел. гіст. часопіс.— 1997.— №1.— С.35—47.

4. Бяспалая М.А. Беларусь на Першай Усерасійскай сельскагаспадарчай і саматужнай выставе 1923 г. // Спадчына.— 1997.— №1.— С.101—109.

5. Бяспалая М.А. Беларуская справа на Барысаўшчыне: Па слядах тэатр. ідэі Цёткі // Полымя.— 1997.— №6.— С.244—247.

6. Бяспалая М.А. ".. а ногі ставяць на сядзенні": Духоўнае жыццё беларускага народа ў 20-я гады XX ст. // Бел. мінуўшчына.— 1997.— №4.— С.74—76.

7. Бяспалая М.А. Пра новыя факты з біяграфіі Уладзіслава Галубка // Тэатр. творчасць. — 1997. — №1. — С.46—47

8. Бяспалая М.А. Жыццё вандроўнага тэатра: Аб дзейнасці тэатра пад кіраўніцтвам У.Галубка ў 20-я гады // Тэатр. творчасць.— 1998.— №1.— С.41—46.

9. Бяспалая М.А. Ідэя самаабкладання як праяўленне новай эканамічнай палітыкі ў галіне культуры (20-я гг.) // Весці Бел. дзярж. пед. ун-та.— 1998.— №1.— С.77—82.

10. Бяспалая М.А. Праблемы культурнага развіцця Беларусі ў 20-я гады і іх месца ў культуралагічнай адукацыі // Культуралагічная падрыхтоўка студэнтаў у сістэме ВНУ.— Мінск: Бел. ун-т культуры, 1998.— С.73—79.

11. Бяспалая М.А. Да пытання аб ролі і месцы бібліятэкі і кнігі ў культурным жыцці вёскі ў 1921—1927 гг. // Матэрыялы Кірыла-Мяфодзіеўскіх навуковых чытанняў, прысвечаных Міжнароднаму дню славянскага пісьменства і культуры (21—22 мая 1997 г.).— Мінск: Бел. ун-т культуры, 1998.— С.166—179.

12. Бяспалая М.А. Да пытання аб сацыяльна-эканамічным стане прыгранічнай вёскі ў пачатку 20-х гадоў // Весці Бел. дзярж. пед. ун-та.— 1998.— №2.— С.86—90.

13. Бяспалая М.А. Да пытання аб уздзеянні новай эканамічнай палітыкі на вёску // Веснік БДУ. Сер.3.— 1998.— №3.— С.11—15.

14. Бяспалая М.А. Пазашкольная праца вясковага настаўніцтва ў 20-я гг. // Пазашкольнае выхаванне.— 1999.— №1.— С.46—48.

15. Бяспалая М.А. Стварэнне калектыўных гаспадарак на Беларусі ў першыя гады нэпа // Бел. гіст. часопіс.— 1999.— №2.— С.37—40.

16. Бяспалая М.А. Да пытання аб вывучэнні гісторыі Беларусі 1920-х гадоў // Гісторыя: праблемы выкладання.— 1999.— №2.— С.9—17.

17. Бяспалая М.А. Да пытання аб культурна-асветніцкім жыцці беларускай вёскі ў 1921—1928 гг. // Зб. дакл. на навук.-метад. канф.: У 2 ч. Мінск: Мінскі ін-т культуры, 1993.— Ч.2.— С.32—34.

18. Бяспалая М.А. Уплыў сацыяльна-палітычных абставін на культурна-асветніцкае жыццё вёскі ў другой палове 20-х гадоў // Актуальныя праблемы і навуковыя пошукі ў галіне культуры і мастацтва: Тэз. дакл.— Мінск: Мінскі ін-т культуры, 1994.— С.9.

19. Бяспалая М.А. Спроба недзяржаўнага выдання на Барысаўшчыне ў пачатку 20-х гадоў // Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 3—4 кастр. 1996 г.).— Мінск, 1997.— С.21—22.

20. Бяспалая М.А. Чуткі як адна з крыніц фарміравання сацыяльна-псіхалагічнага асяроддзя ў беларускай вёсцы пачатку 20-х гадоў // Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання: Матэрыялы да Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 120-годдзю з дня нараджэння У.І.Пічэты (Мінск, 23—24 крас. 1998 г.).— Мінск: Універсітэцкае, 1998.— С.10—11.

21. Бяспалая М.А. Культурна-асветніцкае жыццё беларускай вёскі ў 20-я гады / Бел. ун-т культуры. Мінск, 1995.— 30 с.— Бібліягр.: 56 назв.— Дэп. у Ін-це Белінфармпрагноз 05.06.95, №Д199543 // Человек і эканоміка.—1995. №7.—С.41.

22. Бяспалая М.А. Нэп в белорусской деревне: [События 1921 г. на основании документов этого года] // Фемида.— 1996.— 15—21 апр. (№16).— С.6.

23. Бяспалая М.А. Апошнім аргументам была сіла: Пачатак новай эканамічнай палітыкі у беларускай вёсцы: Гістарычны нарыс // Настаўн. газ.— 1996.— 10 жн.— С.4.

24. Бяспалая М.А. А жыццё пацякло далей... Думкі з нагоды аднаго юбілею: Да 70-годдзя І з'езда работнікаў сельскіх палітыка-асветных устаноў (сак. 1927 г., Мінск) // Культура.— 1977.— 1—7 сак. (№8).— С.9.

## РЭЗЮМЕ

**Бяспалая Марыя Аркадзьеўна**

**БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА Ў 1921—1927 гг.**

*Палітыка новая, эканамічная, падатковая, зямельная, культурная, сацыяльная, асветніцкая; палітасветработа, культура, народная, савецкая; сацыяльна-псіхалагічная сітуацыя.*

Аб'ект даследавання — вёска Цэнтральнай і Усходняй Беларусі ў вызначаны храналагічны перыяд.

Мэта даследавання — комплексны аналіз працэсаў, якія развіваліся ў вёсцы пад уздзеяннем дзяржаўнай палітыкі, і іх уплыву на фарміраванне сацыяльна-псіхалагічнай сітуацыі ў вёсцы.

Аўтар даследуе галоўныя накірункі дзяржаўнай аграрнай і культурнай палітыкі, яе ўкараненне ў вясковае асяроддзе і яе ўспрыняцце сялянствам.

Дысертацыя грунтуецца на прынцыпах гістарызму і аб'ектыўнасці, метадалагічную аснову яе склалі антрапалагічны і аксіялагічны падыходы. У рабоце выкарыстоўваліся агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады даследавання.

Навізна атрыманых вынікаў вызначаецца новай метадалогіяй, якая дазволіла ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі правесці комплексны аналіз сітуацыі, якая склалася ў вёсцы пад уздзеяннем дзяржаўнай палітыкі. Вядомыя раней і зусім невядомыя з'явы і факты аналізуюцца ў рэчышчы новых дасягненняў гістарычнай навукі. Навукова аспрэчваюцца асобныя трывалыя стэрэатыпы, напрыклад, аб значэнні нэпа для развіцця сельскай гаспадаркі, аб выніках рашэння зямельнага пытання, аб ролі новай культуры і іншыя, што таксама вызначае навуковую навізну работы. У навуковы зварот уводзяцца шматлікія архіўныя матэрыялы. Гэта дазволіла прааналізаваць комплекс праблем, якія непасрэдна звязаны з рэакцыяй сялянства на дзяржаўную палітыку. Выкарыстанне не даследаваных да гэтага часу крыніц дазволіла стварыць агульную карціну вясковага жыцця, па-новаму ацаніць эфектыўнасць афіцыйнай палітыкі.

Атрыманыя вынікі могуць выкарыстоўвацца ў далейшых навуковых распрацоўках. Навуковая рэнтабельнасць работы можа выяўляцца ў выкарыстанні факталагічнага матэрыялу і атрыманых вынікаў пры падрыхтоўцы манаграфій, вучэбных дапаможнікаў і навукова-метадычных выданняў, а таксама пры падрыхтоўцы лекцый і правядзенні семінарскіх заняткаў па курсах "Гісторыя Беларусі", "Эканамічная гісторыя Беларусі", "Гісторыя культуры Беларусі".

Дысертацыя мае сацыяльнае значэнне і можа выконваць пэўную выхаваўчую функцыю. Яе тэарэтычныя палажэнні дазволяць з пазіцыі агульначалавечых каштоўнасцей фарміраваць гуманістычныя арыентацыі і грамадзянскія якасці членаў сучаснага грамадства.

## РЕЗЮМЕ

**Беспалая Мария Аркадьевна**

## БЕЛОРУССКАЯ ДЕРЕВНЯ В 1921—1927 гг.

*Политика новая, экономическая, налоговая, земельная, культурная, социальная, просветительская; политпросветработа; культура народная, советская; социально-психологическая ситуация.*

Объект исследования — деревня Центральной и Восточной Беларуси в указанный хронологический период.

Цель исследования — комплексный анализ процессов, которые развивались в деревне под воздействием государственной политики, и их влияния на формирование социально-психологической ситуации в деревне.

Автор исследует главные направления государственной аграрной и культурной политики, ее внедрение в деревенскую среду и ее восприятие крестьянством.

Диссертация основывается на принципах историзма и объективности, методологическую основу ее составили антропологический и аксеологический подходы. В работе использовались общенаучные и специально-исторические методы исследования.

Новизна полученных результатов определяется современной методологией, которая позволила впервые в отечественной историографии выполнить комплексное исследование ситуации, сложившейся в деревне под влиянием государственной политики. Ранее известные и совсем неизвестные явления проанализированы в русле новых достижений исторической науки. Научно оспариваются отдельные устоявшиеся стереотипы, например, о значении нэпа в развитии сельского хозяйства, о результатах решения земельного вопроса, о роли новой культуры и другие, что также определяет научную новизну работы. В научный оборот вводятся многочисленные архивные материалы. Это позволило проанализировать комплекс проблем, которые непосредственно связаны с реакцией крестьянства на государственную политику. Использование ранее не исследованных источников дало возможность создать общую картину сельской жизни, по-новому оценить эффективность официальной политики.

Полученные результаты могут быть использованы в дальнейших научных разработках. Научная рентабельность работы может выражаться в использовании фактологического материала и полученных результатов при подготовке монографий, учебных пособий, и научно-методических материалов, а также при подготовке лекций и проведении семинарских занятий по курсам “История Беларуси”, “Экономическая история Беларуси”, “История культуры Беларуси”.

Диссертация имеет социальное значение и может выполнять определенную воспитательную функцию. Ее теоретические положения позволяют формировать гуманистические ориентации и гражданские качества членов современного общества с позиций общечеловеческих ценностей.

# SUMMARY

## Bespalaya Maria Arcadievna

## Belarusian Village in the Yrs 1921-1927

*Policy new economic, taxation, land, cultural, social, enlightenment, people's culture, Soviet; political-education work, socio-psychological situation.*

The object of the research — the village of Central and Eastern Belarus in the above-mentioned chronological period.

The purpose of the research — a complex analysis of the processes which were developing in the country under the influence of the State policy, their effect on creating social-political situations in the countryside.

The author carries out a research into the main orientations of the State social-economic and cultural policy, its inculcation on the rural environment and its perception by the peasantry.

This thesis is based upon the principles of historical method and objectivity. Its methodological foundation rests on anthropological and axiological approaches. Generally-known scientific and special historical methods have been used in our work.

The novelty of the results is determined by the present time methodology. Owing to this methodology, for the first time in our country's historiography, we have been able to fulfil a complex investigation of the situation established in the village by the State. There have been analysed the previously known and hitherto unknown phenomena in the light of up-to-date achievements of historical science. Some stable stereotypes are being disputed, like the meaning of NEP in the development of agriculture, the settlement of land question results, the role of new culture, and some others. Numerous archives materials have been added in our research. This has led to an analysis of a large number of problems closely connected with the presents' reaction to the State policy. Availing of the until now non-studied sources has made it possible to create a general picture of the rural life, to evaluate anew the official policy effectiveness.

The results obtained may be used in subsequent work. The thesis data and conclusion will provide ample opportunity for writing monographs, text-books as well as for reading lectures and conducting seminars on "History of Belarus", "Economic History of Belarus", "History of Belarusian Culture".

The dissertation has a social meaning performing a definite educational function. Its theoretical propositions permit our forming humanitarian orientations and civil characteristics of the present society members from the position of mankind's values.

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
доктара гістарычных навук

БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА
Ў 1921 - 1927 гг.

Бяспалая Марыя Аркадзьеўна

Падп. да друк.20.07.99г.Фармат 60х84 1/16. Папера пісчая.
Ум.друк.арк.2,32.Ул.выд.арк.2.08. Зак.82. Тыр.100экз.

Рызограф Беларускага універсітэта культуры.
220001,Мінск,вул.Рабкораўская,17.